# ТРЫМАЮЦЬ МАРКУ!

***Літаратурны і біялагічны музеі ВДУ імя П.М. Машэрава ў другі раз пацвердзілі званне «народны».***

**Літаратурны музей** быў створаны ў 1980 годзе па ініцыятыве Давіда Рыгоравіча Сімановіча, Анатоля Мікалаевіча Канапелькі і Зоі Андрыянаўны Андрыянавай. Званне народнага музей упершыню атрымаў у 2015 годзе, на той момант загадчыкам яго была І.В. Саматой. З 2018 года і па сённяшні дзень народным літаратурным музеем кіруе В.І. Русілка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры літаратуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

«Трымаць марку народнага няцяжка, бо ёсць на што абапірацца. Аснова закладзена яшчэ 40 гадоў назад, дзякуючы вядомым беларускім пісьменнікам. І зараз мы працягваем традыцыі, праводзім мерапрыемствы, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца патрыятычнае і эстэтычнае выхаванне. Жыццё ў народным музеі заўсёды «бурліць», – адзначыла Вольга Іванаўна.





У музеі знаходзяцца амаль 800 экспанатаў: ад побытавых рэчаў да кніг і фотаздымкаў вядомых пісьменнікаў. Таксама тут можна паглядзець унікальныя рэлігійныя тэксты кніжных збораў 18 стагоддзя, якія перадаў у музей Леанід Міхайлавіч Вардамацкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры агульнага і рускага мовазнаўства. Таксама тут ёсць кнігі з аўтографамі Петруся Броўкі, Міхася Лынькова, Міхаіла Машары, Рыгора Барадуліна, фотаздымкі Уладзіміра Караткевіча, рукапісы раманаў Алеся Савіцкага.

«У музеі ёсць унікальныя экспанаты. Адзін з самых галоўных – арыгінал газеты «Раздавім фашысцкую гадзіну» за сакавік 1942 года. Яго перадаў мне ў 2000 годзе Алесь Пісьмянкоў, які ў той час быў рэдактарам часопіса «Вожык», – расказала Вольга Іванаўна.

Пры музеі працуе навукова-даследчая лабараторыя «Тэорыя і практыка літаратурнай творчасці», праходзяць розныя мерапрыемствы, арганізуюцца выставы, фотавыставы, сустрэчы з пісьменнікамі (у тым ліку сумесна з абласной арганізацыяй Саюза пісьменнікаў Беларусі), майстакамі і акцёрамі тэатра, літаратурныя канферэнцыі і гасцёўні, конкурсы са студэнтамі і школьнікамі, імпрэзы да юбілеяў мастакоў слова, прэзентацыі падручнікаў па беларускай літаратуры.

**Біялагічны музей** быў заснаваны ў 1975 годзе і сёлета адзначае свой 45-гадовы юбілей. У аснове яго экспазіцыі – калекцыйныя матэрыялы, сабраныя выкладчыкамі кафедры заалогіі ў 1930-я гады і пасляваенны час. Заснавальнік музея – у свой час загадчык гэтай кафедры, дацэнт Анатоль Іванавіч Радкевіч. У афармленні музея ў 1975 – 1977 гадах прымалі ўдзел студэнты-выпускнікі мастацка-графічнага факультэта.

У 1993 і 2006 гадах праводзіліся рэканструкцыі музея. Сёння ў ім размешчаны розныя дыярамы і стэнды, а таксама невялікі куток жывой прыроды з тэрарыумамі, акварыумамі і экзатычнымі раслінамі. Усяго ў фондах захоўваецца больш за 1200 экспанатаў, і гэта калі не лічыць 3600 адзінак насякомых. Напрыклад, у біялагічным музеі можна ўбачыць пазванок сіняга кіта, пудзілы белага мядзведзя і чорнага бусла, яйка страуса, а таксама цудоўную калекцыю матылькоў аматара-энтамолага Пятра Аляксеевіча Донава.

Фонды музея пастаянна папаўняюцца не толькі дзякуючы летнім экспедыцыйным даследаванням выкладчыкаў кафедры заалогіі ВДУ і загадчыка музея Уладзіміра Іванавіча Піскунова, але і з дапамогай студэнтаў-біёлагаў, якія рэгулярна збіраюць матэрыялы падчас палявых практык.

«Трэба адзначыць, што экскурсіі ў народным біялагічным музеі папулярныя не толькі сярод першакурснікаў нашага ўніверсітэта, але і сярод школьнікаў, якія з вялікім задавальненнем слухаюць цікавую інфармацыю і разглядаюць разнастайныя экспанаты», – адзначыў Уладзімір Іванавіч.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**

МЫ І ЧАС
Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П.М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33. Тэл. 37-33-79. Эл. пошта: gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам ва УПП «Віцебская абласная друкарня». ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 27.05.2020 г. у 16.30. Тыраж 810. Аб'ём 2 друк. арк. Зак. 2501.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць адзін раз на месяц.

Галоўны рэдактар В.В. БАГАТЫРОВА
Рэдактар А.А. ДУБРОЎСКАЯ